**Сухоцкая Т.Ф. (Мінск)**

## Тэма катастрафізму ў эстэтыцы Максіма Танка

Перыяды крызісу з’яўляюцца заканамернай з’явай у развіцці гісторыка-культурных цыклаў, калі спадзяванні на прыход светлай будучыні не спраўджваюцца. Крызісныя сітуацыі, як сведчыць гісторыя, звычайна заканчваюцца сацыяльнымі катастрофамі і нават знікненнем этнасаў. Разбураецца створаная сістэма каштоўнасцяў, грамадскія ідэалы і мэты падмяняюцца іх фальсіфікацыяй, знікае повязь пакаленняў. Крызісныя з’явы маюць свае вытокі ў тупіковай сітуацыі сучаснага грамадства, а сёння гэта часы “постмадэрнасці”, калі выжыванне і лёс нацыі залежыць ад таго, на якім грунце будуецца будучыня.

Крызіснае развіццё еўрапейскай культуры прадказалі вядомыя заходнія філосафы XX стагоддзя: М. Хайдэгер (“забыццё быцця”), Г. Марсэль (“канец чалавека”), Т. Адорна (“паражэнне заходняй культуры”), О. Шпенглер (“гібель культуры”) і г.д. Дынаміку культурных працэсаў у крызісным грамадстве вывучалі П. Сарокін, А. Вебер, Р. Мертон. Вядомы культуролаг А. Тойнбі гаварыў, што ў “вестэрнізаваным свеце” чалавечыя заганы, якія былі ў мінулым нечым “ганебным і страшэнным”, ператвараюцца цяпер ў “нясцерпныя і смяротныя”, бо вядуць да “крайнега рыску канчаткова абарваць гісторыю чалавецтва на гэтай планеце” [1, с. 15]. У сучаснай культуралогіі падобныя ўяўленні падмацоўваюцца ў канцэпцыі “глабальнага крызісу” чалавецтва і яго культуры.

Катастрафізм XX стагоддзя трактуецца як асаблівае светаўспрыманне, у аснове якога ляжыць перакананне аб глабальным крызісе сучаснай культуры і цывілізацыі, адчужэнне асобы ў дысгарманізаваным свеце, трагічнасць існавання, страта духоўна-маральных арыенціраў. Усведамленне будучых глабальных катастроф вядзе да фарміравання катастрафічнай свядомасці, якая складваецца на працягу доўгага жыццядзеяння сацыяльнага суб’екта ў працэсе рэзкай дэзарганізацыі ладу жыцця, дэфармацыі культурнай карціны свету, дэструкцыі ў сэнсавай і каштоўнаснай сферы свядомасці, у формах культуратворчасці. У выніку ў культуры фарміруецца свая сімволіка, адбываецца трансфармацыя культурных кодаў.

На сучасны момант істотную ролю ў фарміраванні катастрафічнага светапогляду адыгрываюць сродкі масавай інфармацыі: шматлікія прыродныя, сацыяльныя і тэхнагенныя катастрофы становяцца жыццёвым фонам, звычайным элементам чалавечага быцця. “Смакаванне” тэхналогій забойстваў і злачынстваў сцвярджае права на існаванне некрафільства ў сучаснай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Катастрафізм – неад’емная рыса культуры кожнага народа. Страх канца свету, апакаліптычнае светаадчуванне заўсёды былі ўласцівы чалавеку, што знайшло адлюстраванне ў эсхаталагічных міфах і ва ўсіх рэлігійных традыцыях.

Негатыўны мінулы вопыт этнічнай і нацыянальнай самаіндэнтыфікацыі генерыруе страх перад будучыняй. Дзейнасць улады, інстытутаў культуры, сродкаў масавай інфармацыі павінна быць скіравана на зніжэнне небяспечнага ўзроўню катастрафізму ў масавай свядомасці людзей, найперш, праз ўсведамленне адказнасці перад культурай.

Трагічныя калізіі XX стагоддзя пасеялі зерне песімізму і фаталізму і ў свядомасці многіх мастакоў, пісьменнікаў, паэтаў. Мастацкім сімвалам сусветнай катастрофы стала самая вядомая, вялікая палітычная карціна XX стагоддзя “Герніка” П. Пікассо – расчыненыя вароты, праз якія ўрываецца да людзей, абрушваецца на іх жах непамернай катастрофы. П. Зюскінд (“Парфумер”) катастрафічныя прадчуванні выявіў праз ўсеагульнае вар’яцтва, калі знішчана розніца паміж дабром і злом. Пісьменнік перасцярагае пра злачынства, якое тоіцца ў разрыве з прыродай, у бессаромным і бязлітасным гвалце над ёю. Створаны з пахаў свет П. Зюскінда нагадвае свет, створаны з колераў у эксперыментах В. Кандзінскага і К. Малевіча. Філасофія татальнага нігілізму канца XIX – пачатку XX стагоддзя перакрэслівала магчымасць спалучэння рэаліяў эпохі з першапачатковым сэнсам быцця, вызваляла творчасць ад рэальнасці, якая закончылася правалам у нішто. Супрэматызм К. Малевіча стаў папярэджаннем пра рух ў нікуды. Чорны квадрат на чорным фоне – ілюстрацыя вынікаў тварэння новага свету па-за рэальным светам.

Вялікі гнасеалагічны вопыт, накоплены беларусамі ў мастацтве слова, якое фарміруе нацыянальную філасофію і эстэтыку, не толькі выявіў трагізм чалавечага існавання ў свеце, але і сцвердзіў радасць зямнога існавання – “казку жыцця”, прапанаваў варыянты выхаду з тупіковых сітуацый. Беларуская літаратура зыходзіла з ідэі катастрафізму XX стагоддзя. “Кепска будзе”, – сцьвярджаў Ф. Багушэвіч. М. Багдановіч дабавіў індывідуальнае адчуванне катастрафізму. На золку XX ст. ўбачыў пачатак цёмнай ночы – абезгалоўлены, без будучыні час. У паэзіі С. Дзяргая ён суаднесены з выпаленым знутры домам з расчыненымі дзвярамі. У творах В. Быкава (“Ваўчыная зграя”, “Знак бяды”, “Ваўчыная яма”) гучыць перасцярога аб пагрозе паўзучай сацыяльнай катастрофы, ператварэння культурнай прасторы ў радыёактыўны сметнік. Адлюстраваннем катастрафічнай свядомасці ў беларускай культуры сталі сімвалы: лічбы на сэрцы, акупацыя, сцяна, ваўчыная яма, зона.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Парадаксальнасць быцця нашы продкі зафіксавалі праз існаванне багінь Яві і Наўі, уладальніц зямнога і падземнага светаў. Багі і героі перамаглі ўладу цёмнай Наўі і сцвердзілі права светлай Яві, каштоўнасным сімвалам якой стала квітнеючая ніва. Сучасная крызісная сітуацыі можа паказаць раптоўна новую рэальнасць. У супольнага суб'екта для яе пераадолення не хапае рэсурсаў. У народнай культуры асілак з'яўляецца гатовы, узнікае раптоўна. Спасцігаецца свядомасцю не па частках, а схопліваецца цалкам. Дзеездольнасць супольнага суб'екта абумоўлена вяртаннем да чалавечай роднасці.

Гісторыя культуры – гэта пераадоленне стану разрыву і пошук выйсця на новыя прасторы кагнітыўнага дзеяння. У беларускай культуры сцвярджаецца магчымасць іншага варыянту быцця. Вядучым стымулам жыццядзеяння стала тварэнне новага соцыуму ("на новы лад, каб жыць нанова" – Я. Колас; "калі няма жыцця – яго стварыць" – М. Танк). Элементы катастрафізму ў творчасці многіх беларускіх паэтаў, пісьменнікаў, мастакоў (Я. Купалы, Я. Коласа, Я. Драздовіча, М. Танка, М. Савіцкага, Г. Вашчанкі і іншых) – гэта момант парадоксу ў згарманізаваным існаванні чалавечага і прыроднага космасу. Узровень трагічнага перажывання і асэнсавання эпохі ў іх творах фарміруе сілу пераадолення тупіковай сітуацыі трагічнага абсурду. Беларускія мысліцелі У. Самойла, В. Ластоўскі, І. Канчэўскі ў пачатку XX стагоддзя прапанавалі новую, дзейсную мадэль калектыўнай арыентацыі – "крытычны аптымізм".

Катастрафічны пафас выяўлены ў паэзіі М. Танка яшчэ ў ранніх вершах на заходнебеларускую тэматыку. Пачуццём беззыходнасці, трагічнасці прасякнуты верш "Песня кулікоў". Драматызм успрымання жыцця абвострany да трагічнасці:

I ў нас цёмна, змрочна, толькі час ад часу
Загарыцца сонца паміж нашых стрэх …[3, с. 150]

Занядбанне роднай мовы, Чарнобыль – праблемы, якія спрыяюць нарастанню катастрафічнага светабачання паэта. Тэхнагенная аварыя як новая хваля генацыду беларускага этнасу абвастрае праблемы жыцця і выжывання.

Калі хавалі
Забітую Чарнобылем Зямлю,
Былі толькі далакопы,
Бульдозеры
I вянкі з калючага дроту … [2, с. 151]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Згушчэнне трагічнага светаадчування перарываецца нярэдка ў М. Танка прасветлінамі жыццялюбства, што пацвярджаецца повяззю яго духоўнасці з народнай культурай.

Праз зварот М. Танка да матываў катастрафізму была сцверджана мужнасць духу суб’екта як неабходная ўмова для пераадолення, дыялектыка якога адлюстроўваецца не ў формах барацьбы супрацьлегласцей, а як дынаміка плана імманентнасці, выказанага М. Танкам праз паэтычны канцэпт “прайсці праз вернасць”. Па сутнасці, гэта – маральны імператыў, які мае на ўвазе эвалюцыю суб’екта з захаваннем вернасці самому сабе. Дадзеныя інтэнцыі ўласцівы вершу “Перад “Рабамі”. Паэт ў ёмістай форме здолеў падкрэсліць адметнасць экспрэсіўнага, бунтоўнага, сэнсаёмкага стылю Мікеланджала і сутнасць яго асобы – прарока з нязломным духам.

Зацяжныя і вострыя крызісы ў гісторыі чалавецтва не заўсёды і не адразу знаходзілі выхад да якасна новага грамадскага стану, бо сацыяльнае дзеянне суб’екта ў падобнай сітуацыі звычайна абмяжоўваецца пасіўным чаканнем перамен. Паэзія Максіма Танка адкрывае перспектыўныя шляхі нашага самасцвярджэння ў няўстойлівым свеце, паказвае дарогу людскасці новым пакаленням. У сваёй творчасці паэт закранае многія культуралагічныя праблемы: станаўленне суб’екта культуры, культуратворчасці, культурагенезу і іншыя. Сусвет, створаны М. Танкам трымаецца на кагнітыўнай дзейнасці чалавека, на яго крэатыўнасці.

Такім чынам, катастрафізм мы можам вызначыць як мегатэндэнцыю сучаснага цывілізацыйнага развіцця. Эпоха сучаснага крызісу з’яўляецца адначасова пачаткам станаўлення новага быцця чалавецтва ў формах суверэнных нацыянальна-дэмакратычных дзяржаў. Рашаючая роля ў гэтым працэсе належыць мастацкім формам самасцвярджэння супольнага суб’екта культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура

1. Тойнби, А. Постижение истории / А. Тойнби. – М.: Просвещение, 2002. – 268 с.

2. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Т. 6 : Вершы (1983–1995). – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 454 с.

3. Танк, М. Мне пару крыл дало юнацтва… : выбр. лірыка / М. Танк. – Мінск : Маст. літ, 2003. – 479 с.